# Мой універсітэт

Баранавіцкая ўніверсітэцкая газета
Выдаецца з 15 кастрычніка 2004 года

3 мая 2013 года, № 3 (106), спецвыпуск

E-mail: news.barsu@mail.ru

Чытайце «Мой універсітэт»:
www.barsu.by;
vk.com/news.barsu («ВКонтакте»)



# «ЯК ЖЫЦЬ — ДЫК ЖЫЦЬ ДЛЯ БЕЛАРУСІ!»

З вопыту работы

*Любіце гэтую святую зямлю аддана і да канца.*
*Іншай вам не дадзена, дый не патрэбна.*

**У. Караткевіч**


Майстар-клас у аграсядзібе «Кузевічы»


У лабараторыі швейнай вытворчасці

# Вучым і выхоўваем ГРАМАДЗЯНІНА

***Вялікая і шырокая спадчына беларускага народа-творца. Вывучэнне культуры Беларусі, у тым ліку і народнай адзежы, мае вялікае значэнне ў выхаванні патрыятычных, маральных, эстэтычных якасцяў студэнтаў пры кафедры тэхналогіі і выяўленчага мастацтва. Далучэнне да фальклору, народнай творчасці непасрэдна праз вывучэнне дысцыплін, гуртковую і практычную дзейнасць — адна з тых трывалых нітак, якая злучае студэнтаў з традыцыямі мінулага, са сваёй Радзімай.***

Пры вывучэнні мадэляў і канструкцый, тэхналагічнай апрацоўкі адзежы вялікая ўвага надаецца сучасным фальклорным традыцыям, якія захаваліся да нашага часу. Падчас курсавога праектавання на аснове даследавання матэрыялаў народнай творчасці студэнты рэканструююць беларускія народныя гарнітуры, а самадзейнае мадэляванне вырабаў з выкарыстаннем вобразнага строю беларускай народнай адзежы з'яўляецца творчым працэсам развіцця фальклорных традыцый.

Па-за заняткамі таксама працягваецца фарміраванне цікавасці да гісторыі народнай творчасці. У рамках гуртковай працы студэнты паспяхова рэалізуюць задачы стварэння адзежы з выкарыстаннем прынцыпаў праектавання народнай адзежы з улікам выканання сучасных эстэтычных і функцыянальных патрабаванняў, выкарыстоўваючы пры гэтым айчынныя тканіны.

Дзейнасць студэнтаў у лабараторыі швейнай вытворчасці ў перыяд вытворчай практыкі не толькі спалучае розныя выгляды прац: бісерапляценне, вышыўка крыжыкам, гладдзю, стужкамі, лапікавую тэхніку, — але і адкрывае студэнтам цудоўны свет народнага мастацтва, які нясе ў сабе шматвяковыя ўяўленні пра прыгажосць і гармонію.

Вынік практычнай дзейнасці студэнтаў можна ўбачыць на ўвесь час дзейснай выставе ў лабараторыі тэхналогіі швейнай вытворчасці, дзе прадстаўлены як комплексныя творчыя працы студэнтаў («Інтэр'ер сучаснай кухні» з выкарыстаннем фальклорных матываў, пано «Чаяванне на прыродзе»), так і індывідуальныя (ручнікі, дадаткі да інтэр'еру, лялькі-сувеніры, засцярогі, пано, беларуская адзежа і інш).

Традыцыйным стаў удзел выкладчыкаў кафедры і студэнтаў у рэгіянальным фэсце па агра-экатурызме, які праходзіць у аграсядзібе «Кузевічы», дзе выкладчыкі і студэнты праводзяць майстар-класы па тэхніках дэкаратыўна-прыкладной творчасці, асаблівасцям беларускай кухні, і такім чынам усе прысутныя могуць пазнаёміцца з экспанатамі выставы, што нясуць у сабе цеплыню і каханне да роднай Беларусі.

Вялікую працу па патрыятычным выхаванні моладзі праводзіць народны ансамбль «Музычны гасцінец», удзельнікамі якога падрыхтаваны аранжыроўкі музычных твораў беларускіх кампазітараў і беларускіх народных песень.

З мэтай грамадзянска-патрыятычнага выхавання куратарамі груп у рамках інфармацыйных гадзін былі арганізаваны і праведзены мерапрыемствы, накіраваныя на прапаганду нацыянальна-дзяржаўных ідэй і абарону нацыянальных прыярытэтаў, сярод якіх — беларуская дзяржаўнасць і самастойнасць; шматпалярнасць сучаснага свету, гісторыка-культурная самабытнасць, сацыяльна-арыентаваная палітыка, Саюз Расіі і Беларусі.

Стала добрай традыцыяй арганізоўваць паездкі і экскурсіі для студэнтаў па гістарычных і літаратурных месцах Беларусі.

***ЛІЛІЯ УРБАНОВІЧ,***
***намеснік дэкана факультэта педагогікі і псіхалогіі***

*Няхай краса любімае зямлі*
*У задушэўнай песні адгукнецца.*
*А. Астрэйка*

Досуг

# Творчасць — сама сутнасць жыцця ў свеце ведаў і прыгажосці

***Пад такім дэвізам ажыццяўляецца сумесная культурная дзейнасць студэнтаў і спецыялістаў студэнцкага клуба ўстановы адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт» у вольны час.***


*Удзельнікі рэспубліканскага фестывалю «Арт-вакацыі-2012»*

Задавальненню разнастайных духоўных запатрабаванняў студэнцкай моладзі спрыяюць 16 творчых калектываў і аб'яднанняў па інтарэсах, чатыры з якіх носяць ганаровае званне «Народны аматарскі калектыў» — ансамбль «Музычны гасцінец», тэатр моды «Світа», тэатр мініяцюр «Сафіт» і студыя эстраднай песні «Талент», шэсць калектываў функцыянуюць на грамадскіх пачатках.

Далучаючы студэнтаў да духоўных каштоўнасцяў сусветнай і нацыянальнай культуры, спецыялісты студэнцкага клуба БарДУ фарміруюць эстэтычную прастору, развіваюць жанравы дыяпазон аматарскіх творчых аб'яднанняў, ствараюць спрыяльныя ўмовы для выяўлення крэатыўных здольнасцяў студэнтаў, выкладчыкаў і арганізуюць змястоўны, пазітыўны вольны час моладзі.

Развіваць традыцыі ўніверсітэта, фарміраваць карпаратыўную свядомасць, палікультурнае мысленне дапамагаюць папулярныя творчыя праекты «Таленты БарДУ», «Лепшая «Крэатыў-каманда» ўніверсітэта», «Віват, першакурснік! Віват, БарДУ», «Толькі навука на зямлі служыць людзям вечна» (да Дня беларускай навукі), «Для тых, хто імгненне гэтае доўга чакаў…» (цырымонія ўшаноўвання лепшых выпускнікоў) і шматлікія іншыя.

Дзякуючы падтрымцы адміністрацыі і таленавітай моладзі сталі магчымыя творчыя перамогі мастацкіх калектываў студэнцкага клуба Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта на шматлікіх конкурсах і фестывалях не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, але і ва Украіне (Роўна), у Расіі (Масква, Мыцішчы) і інш.

Кожнае мерапрыемства ва ўніверсітэце — гэта заўсёды велізарная творчая падзея для выкладчыкаў і студэнтаў, свята карпаратыўнага яднання, добрых пачуццяў і станоўчых эмоцый!

***ІНА ГАНЧАР,***
***метадыст СКТЦ***


*Прэм'ера спектакля «Усміхні свой твар!» народнага тэатра мініяцюр «Сафіт»*


*Святочная канцэртная праграма для ветэранаў 203-га гвардзейскага авіяпалка*

# Я — ГРАМАДЗЯНІН БЕЛАРУСІ



*Сімвалічны момант уручэння «ключа да ведаў» у межах традыцыйнага свята «Віват, першакурснік! Віват, БарДУ!»*



*Адзіныя дні інфармавання з удзелам кіраўніцтва горада, вобласці, краіны*



*Традыцыйныя сустрэчы з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў і мясцовых Саветаў*




*Экскурсіі па гістарычных мясцінах Беларусі*



*Наведванне Музея гісторыі прафсаюзнага руху ў рамках навучання прафсаюзнага актыву*



*Шчырае вітанне гасцей БарДУ*



*Традыцыйныя наведванні студэнтамі і супрацоўнікамі ўніверсітэта святых мясцін Беларусі*



*Штогадовая спартакіяда «Здароўе»*




*Штогадовы святочны канцэрт, прысвечаны Дню Перамогі*

Дасягненні

*Дзе прайшло маленства, там пачынаецца Радзіма.*
***К. Чорны***

# «Мая Беларусь...»

Беларусь… Як шмат значыць гэтае слова для нас, яе дзяцей. Гэта і родныя, знаёмыя з дзяцінства краявіды, і прыгожыя, працавітыя, сціплыя людзі. Радзіма... Родная старонка… Самы блізкі і дарагі сэрцу куточак. З дзяцінства памяць убірае ўсе самыя цікавыя і запамінальныя, уражлівыя і пяшчотныя, вялікія і дробныя праявы і малюнкі радзімага краю. Дзе заканчваецца дзяцінства, там пачынаецца Радзіма. Якім вялікім змястоўным сэнсам напоўнены гэтыя радкі!

Бацькоўская хата, матчына песня, спеў жаваранка, клёкат буслоў, самыя пахучыя і прыгожыя лугавыя кветкі, росныя раніцы — усё гэта мая любая Радзіма. Беларусь! Яна, як матуля, без якой не нараджацца, не жыць, не дыхаць. «Люблю свой край, старонку гэту, дзе я радзілася, расла…», — напісала К. Буйло. І словы гэтыя сталі гучаць па-народнаму проста і шчыра, адкрыта і даверліва. Напэўна, кожны ў сваёй душы мае штосьці падобнае да гэтага пачуцця, а можа, і нешта большае, непадуладнае слову. Калі птушкі прылятаюць з далёкага выраю на свае балоты, ва ўтульныя зялёныя шаты беларускіх лясоў, ведаю — імі кіруе прыцягальнае пачуццё, значыцца, і яны пакланяюцца роднаму краю.

Жывём мы на гэтай чароўнай багатай зямлі і за штодзённымі клопатамі не заўважаем яе хараства, прывыкаем да усёй гэтай прыгажосці. І па-сапраўднаму адчуваем Радзіму толькі ўдалечыні ад яе. Як хочацца тады пачуць гучанне роднай мовы, убачыць роднае неба, удыхнуць роднага паветра.

Вось так паўстае Радзіма ў маім уяўленні.

Беларусь! І нікуды мне не дзецца ад цябе, мая шчырая, мая спеўная, мая адзіная! Раніцай ты так пяшчотна заглядваеш у мае вочы, каб запытацца, ці люблю. «Люблю, люблю, люблю», — шапчу табе я. І мае словы паўтараюць ветрык з лістамі, васільковае поле, зялёны лес і пахучая трава. Ды і як цябе не любіць? Як не шанаваць? Мне да болю шкада цябе і тваіх верных сыноў і дачок, тваіх смелых дзяцей, якія за цябе, родная краіна, пайшлі на смерць, бо жыццё без Радзімы не мае сэнсу.

Я веру ў цябе, мая сінявокая, як верылі і Колас, і Багдановіч. Ты будзеш жыць і квітнець, бо мы, твае дзеці, суцішым твой боль і непакой. Я не хачу, каб ты сумавала, мая дарагая Радзіма! Я з табой. І пакуль б'ецца маё сэрца, я буду любіць твае лугі і рэкі, сонейка і хмары, лясы і палі. Мяне так цешыць і забаўляе шчэбет птушак, гоман дубоў, мілагучны напеў рэчак. І ты, мая пакутніца, яшчэ спяваеш?! Спяваеш у горы і няшчасці? Якая ж ты моцная!

Я часта ўспамінаю, якой я цябе ўпершыню ўбачыла і палюбіла назаўсёды. Вось ты нахілілася над маёй калыскай і глядзіш прамяністымі матчынымі вачыма; калі я нарадзілася, ты размаўляла са мной такой сардэчнай, задушэўнай мовай. Ты радавалася мне і пяшчотна клапацілася, каб мяне ніхто не пакрыўдзіў. Ты калыхала мяне на шурпатых ад працы, але такіх ласкава-цёплых бабуліных руках.

Дзякуй, мая самая добрая і прыгожая ў свеце Радзіма. Дзякуй вам, мае бацькі, што навучылі па-сапраўднаму любіць.

Дзякуй, мая зямелька, што абераагеш мяне. Калі я пачала падрастаць, ты паслала мне верных і шчырых сяброў, якія ніколі не здрадзяць мне. А калі цяжка бывае ў мяне на душы, дык ведаю, што мяне супакоіць толькі адно: усведамленне, што ў цябе, Радзіма, усё добра.

Я з гонарам магу сказаць, што мне ніколі не будзе сорамна за сваю зямлю, за свой народ, які за час амаль тысячагадовага існавання ніколі не стаў рабаўніком, захопнікам.

А зараз мне хочацца зазірнуць у будучыню, напэўна, яна будзе спакайнейшая, чым сённяшні дзень. Войны ў свеце супакояцца. Дзяржаўнай мовай стане наша «льняная і жытнёвая, сялянская, старажытнейшая» беларуская мова. Я таксама буду дапамагаць табе.

Я хачу, каб ты, мая Радзіма, верыла, што я люблю цябе, люблю шчыра, моцна і аддана. Толькі любі і ты нас, сваіх дзетак, якім не пражыць без маці-радзімы, як не пражыць без паветра.



*Юлія Масюк,студэнтка IV курса інжынернага факультэта*

*P.S. Аўтар эсэ «Мая Беларусь», студэнтка IV курса інжынернага факультэта Юлія Масюк у творчым конкурсе юных карэспандэнтаў «Зямля бацькоў — зямля надзеі нашай», прысвечанага Году кнігі, была ўзнагароджана дыпломам III ступені ў намінацыі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся» сярод студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі.*

*Арганізатарамі творчага спаборніцтва юных карэспандэнтаў выступілі абласная арганізацыя РГА «Белая Русь» і рэдакцыя абласной газеты «Народная трыбуна». Мэтай конкурсу была падтрымка творчай ініцыятывы дзяцей і моладзі, прапаганда патрыятызму, ідэй любові да роднага краю і беларускай мовы, а таксама пашырэнне юнкораўскага руху на Брэстчыне.*

*Усяго журы ацаніла 152 работы, сярод якіх былі замалёўкі, эсэ, інтэрв'ю, фотарэпартажы.*

**ЮЛІЯ МАСЮК,**
**студэнтка IV курса**
**інжынернага факультэта**

*Быць чалавекам на зямлі зямля бацькоў дала мне права*
*Р. Барадулін*

**Жыццё у інтэрнаце**

# Грамадзянская мужнасць. У чым яна?



Госці вечера Ю. А. Вараб'ёў и В. І. Крывашлыкаў (злева направа)

Студэнцкі актыў інтэрната па вул. Убарэвіча, 18, у музеі славы 203-га гвардзейскага авіяпалка правёў мерапрыемства, прысвечанае Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў і Дню абаронцы Айчыны. Гасцямі вечара былі гвардыі маёр В. І. Крывашлыкаў, старшыня Савета ветэранаў 203-га гвардзейскага палка дальняй авіяцыі, палкоўнік запасу Ю. А. Вараб'ёў, старшыня Савета ветэранаў 61-й авіябазы, Л. Шувалава, кіраўнік паэтычнага клуба «Ліра».

На вечары гаворка ішла пра мужнасць і гераічнасць людзей, лёс якіх звязаны з арміяй. Студэнты ўдзельнічалі ў абмеркаванні пытанняў, якія прымушалі задумацца пра такія высокія паняцці, як «сумленнасць», «мужнасць», «бескарыслівасць», «пачуццё абавязку і адказнасці перад Радзімай». Перад студэнтамі выступілі і нашы госці, якія распавялі пра гісторыю 203-га гвардзейскага авіяпалка, подзвігу лётчыка Уладзіміра Карвата. Познім вечарам 23 мая 1996 года ён адправіўся ў палёт, з якога не вярнуўся… «Самалёт некіруемы!» — гэта былі апошнія яго словы, якія паляцелі на зямлю сігналам бедства. Ён мог бы адразу катапультавацца паводле загада з зямлі. Але ён гэтага не зрабіў. Ён адводзіў знішчальнік-перахопнік далей ад населеных пунктаў.

Вядучыя М. Буйкевіч і А. Шчарбук расказалі нам і пра подзвіг лётчыкаў з г. Баранавічы: «30 жніўня 2009 года адбылося міжнароднае авіяшоў у польскім Радаме. Знішчальнік СУ-27 пасля каскаду фігур вышэйшага пілатажу пачаў падаць. Яшчэ імгненне, і шматтонная крылатая машына абрынулася б на людзей. Але беларускія лётчыкі палкоўнікі Аляксандр Марфіцкі і Аляксандр Жураўлевіч адвялі самалёт ад жылых хат…».

Паэтка Л. Шувалова прачытала верш «Дзвюм Аляксандрам»:

*Страшэнны выбух чорнахмарны,*
*Нашчэнт разбіты самалёт.*
*СУ-27 згарэў ахвярна,*
*Двух сэрцаў скончыўся палёт.*
*Яны маглі б уратавацца,*
*У кругавароце тых падзей,*
*Ды вышла ў пекле заставацца,*
*Адвёўшы гібель ад людзей.*
*Так шоў палыхнула смерцю,*
*Матор ці сувязь, што яшчэ…*
*Бяда змагла руку прасцерці,*
*Сляза гаручая пячэ.*
*Жалобны марш, вянкі, штандарты,*
*Шарэнгі лётчыкаў стаяць.*
*І войска польскага салдаты*
*Ідуць героям чэсць аддаць.*
*Кранае сэрца гук мінорны,*
*Ляціць і зблізку, і здаля,*
*Двум Аляксандрам, птушкам зорным,*
*Апошні гімн спяе зямля.*
*Смуткуюць маці, жонкі, дзеткі,*
*Герояў абарваўся лёс,*
*Апошні шлях, крыжы ды кветкі,*
*Крык раставання да нябёс.*

**ЯНА ШТЭНГЛЕР,**
***студэнтка факультэта славянскіх і германскіх моў***

## „Проба пера"

### Родная матуля

У кожнага ёсць дарагое сардэчка,
Якое клапоціцца ўдзень і ўначы,
Да якога па хвалях жыццёвая рэчка
Прынясе здаляка, без жадання ўцячы.

Да якога ўсе думкі бягуць мімаволі,
Да якога заўсёды цягнецца рука,
Без якога жыццю крыкнеш моцна «Даволі!»,
Калі ўглыб панясе цябе плынню рака.

Мама! Матуля! Родная Маці!
Добрая, моцная, самая лепшая!
Я поўнасцю, цалкам гатова аддаці
Жыццё для таго, каб ты жыла вечна!

**НАТАЛЛЯ КУЛАК,**
***студэнтка факультэта педагогікі і псіхалогіі***

### Мая Радзіма

У кожнага з нас ёсць свая дарагая мясціна.
Мая — гэта любыя Стоўбцы, малая радзіма.
Я тут нарадзілася, «мама» сказала,
У школу пайшла,
І месца раднейшага ў свеце, як гэта,
Няма.

Тут мама і тата, сястрычка мая,
Бабулі, дзядулі і наша радня,
Сябры і суседзі, настаўнікі, я —
Усе мы стаўбчане, адна мы сям'я.

Хай буду далёка, а ў сэрцы навекі
Адзіным, любімым мой горад маленькі
Жыць будзе, бо кожная сцежка знаёма...
Усё тут маё: і паветра, і неба, і сонца,
І Нёман.

**СВЯТЛАНА ЯНЧУР,**
***студэнтка факультэта эканомікі і права***





Карысная і цікавая інфармацыя,
інтэрактыўнае галасаванне,
аб'явы, гульні —
усё гэта ў сацыяльнай сетцы
«ВКонтакте» на старонцы
групы «Газета БарГУ on-line».

**Вяртанне да вытокаў**

*Яснага блакіту табе, зямля бацькоў, родны кут!*
***Р. Барадулін***

# Буслы, як людзі...

*Мае ўсе думы пра цябе, мой род...*
*Бусліны край, мой вырай і прыстанак*
*Н. Загорская*

Кажуць, здаўна на Беларусі замест людзей жылі буслы. Жылі хораша і дружна. Лятаць яны яшчэ ў тую пору не ўмелі, бо крылы іх былі недасканалыя. Працавалі буслы, хадзілі па зямлі, грэліся на Сонейку. І неяк незнарок у важака чарады буслоў узнікла жаданне падняцца высока ў неба, пабачыць Сонейка зблізку і паглядзець на родную Зямлю з вышыні.

Сталі буслы трэніраваць свае крылы і аднойчы падняліся ў неба. Вышэй за ўсіх падняўся важак.

— Хараство якое! — усклікнуў важак, глянуўшы ўніз на Зямлю, і падняў галаву да Сонейка.

Сонейка, якое да гэтага часу жыло спакойна, лагодна грэючы Зямлю і адчуваючы сябе самым галоўным, вытарашчыла здзіўленыя вочы:

— Што гэта за смельчакі такія знайшліся?

І паслала насустрач буслам свае вогненныя праменьчыкі. Параненыя буслы ўпалі на зямлю.

Больш за ўсіх пацярпеў важак, бо ён знаходзіўся бліжэй да Сонейка. Доўга залечвалі яны свае раны. Жаданне лятаць прапала на тысячы гадоў. Яны сталі абыякава адносіцца да сваіх абавязкаў. Сталі злавацца і папракаць адзін другога невядома ў чым.

І толькі адзін важак не страчваў надзеі яшчэ раз падняцца ў неба, яшчэ раз пабачыць Сонейка зблізку, а Зямлю здалёк.

І аднойчы ён падняўся да Сонейка яшчэ бліжэй, чым у першы раз.

— Эге-ге-гей! — сказала Сонейка.

— Дык вось, які ты дасціпны ў дасягненні сваіх жаданняў. Малайчына! Я аддзячу цябе за гэта. У цябе будуць дужыя і прыгожыя крылы, ты будзеш умець прыгожа планіраваць над сваёй Зямлёй, але навучы гэтаму сваіх малодшых братоў і сясцёр. А яшчэ я надзяляю цябе цудоўным дарам хораша спяваць, толькі перадавай гэты талент іншым. Справа гэта нялёгкая, але пастарайся справіцца, ад цябе цяпер залежыць лёс твае Зямлі.

— Навучыся ўменню цярпець і выбачаць, — дабавіла на развітанне Сонейка.



Вярнуўшыся на зямлю, Буслік намерыўся споўніць усё, што наказала яму Сонейка.

Дар добра лятаць і хораша спяваць перадаўся ўсім буслам. Сталі ж паміж імі ўзнікаць спрэчкі:

— Я сам навучыўся!

— Я ужо ўмею!

— Я лятаю не горш за цябе!

Ад гэтых звадак і спрэчак сталі на зямлі з'яўляцца розныя людзі: добрыя і злыя, прыгожыя і не вельмі. Важак хацеў прымірыць буслоў, але яны адштурхнулі яго ад сябе. Пакрыўджаны Буслік памкнуўся на балота, каб памерці, але не лёс быў яму паміраць. Сонейка, як магло, абагравала яго ўзімку.

Ад гора, ад суму Буслік пачарнеў, але сам ён гэтага не ведаў, а Сонейка спрыяла таму, каб Буслік не памёр, падкідвала на балотца таго-сяго з ежы, бо добра ведала, што без былога важака нашчадкі не здолеюць зберагчы сваю Зямлю.

З наступленнем вясны Буслік пацягнуўся да сваіх, але яны не прынялі яго, не пазналі, не паверылі, што толькі знешне змяніўся іх важак, а душа засталася тая ж.

З тых пор і жывуць паасобку яны.

З тых пор і не ўжываецца дабро і зло.

І пакуль яны не здолеюць прымірыцца, не наступіць поўны душэўны і маральны супакой на Зямлі.

Будзем неабыякавыя, будзем ра-зам засцерагаць і захоўваць мудрасць нашых продкаў.

Хіба можна не любіць зямлю, якая цябе ўзгадавала, як можна не цікавіцца яе мінулым, як можна не занатоўваць гэтыя святыні ў нашай памяці, як можна не надаваць святыням новае жыццё? А калі хто захварэў гэтай неабыякавасцю да народнай спадчыны, то няхай дапамажа яму Чорны Бусел і Гасподзь Бог.

Пойдзем у вандроўкі і паглядзім, на што багаты наш край, якую ён мае духоўную культуру, і возьмем з сабой людзей з чулай душой і добрым сэрцам.

Вунь колькі яшчэ неразведаннага намі, а калі мы не здолеем знайсці сёння, заўтра ўсё гэта знайсці будзе немагчыма. Спяшаймося зрабіць добрую справу, бо нашы дзяды і прадзеды пакінулі нам сляды, каб мы па іх крочылі і не заблудзіліся, не прапалі зніч.

***ТАЦЦЯНА РАДОМСКАЯ,***
***кіраўнік клуба «Вяртанне да вытокаў»***

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Нумар падрыхтавалі:** М. М. Матчэня, Т. Р. Якубовіч, П. І. Папко Адказны за выпуск М. М. Матчэня | **Наш адрас:** 225404, Брэсцкая вобласць, г. Баранавічы, вул. Война, 21, каб. 3. Тэл.: 8(0163) 45-78-60 | **Выдаецца з кастрычніка 2004 года.** Падпісана ў друк 3. 05. 2013 Заказ 79 | **Карэктары:** А. П. Сянько Камп`ютэрная вёрстка М. М. Матчэні Тыраж 100 экз. |

Аддрукавана на капіравальна-размнажальнай тэхніцы рэдакцыйна-выдавецкага аддзела Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта